Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
__________________ А.І.Жук
«___» _____________2011 г.
Рэгістрацыйны №, ТД- ___ / тып.

# МЕТОДЫКА АРГАНІЗЫЦЫІ ФАЛЬКЛОРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ: РЭЖЫСУРА КАЛЯНДАРНЫХ АБРАДАЎ
## (Раздзел 2)

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў**
**Спецыяльнасць 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)**
**Напрамак спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)**

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела
навучальных устаноў
і работы з творчай моладдзю
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
______________А.У.Рыбчынская
«___»__________2011 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення
вышэйшай і сярэдняй
спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________ Ю.І.Міксюк
«___» ___________2011 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
______________ Б.У.Святлоў
«___» ___________2011 г.

Рэктар дзяржаўнай
установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы»
____________ В.І.Шупляк
«___» ___________2011 г.

Эксперт-нормакантралёр
_____________________
«___» ___________2011 г.

Мінск 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІК:**
Пладунова Т. А., старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору Установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

кафедра этналогіі і фальклnetwork ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка»

Гуд П. А., загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і святаў Установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” прафесар, кандыдат гістарычных навук.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

кафедрай этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» пратакол № 9 ад 15. 04. 2010 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 08. 06. 2010 г.);

навукова-метадычным саветам па народнай творчасці (па напрамках) Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 19. 11 .2010 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю:

Адказны за выпуск:

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура каляндарных абрадаў" распрацавана для студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасці 1-18 01 01 "народная творчасць" напрамак 1-18 01 01-05 "фальклор". Курс па "Рэжысуры каляндарных абрадаў" з'яўляецца часткай вучэбнай дысцыпліны "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці", у які таксама ўваходзяць вучэбныя курсы па "Рэжысуры сямейна-родавых абрадаў" і "Гульнёваму фальклору".

Праблема пераемнасці і папулярызацыі найбольш яскравых і рэпрэзентатыўных з'яў каранёвай беларускай культуры – адна з важных і складаных для паспяховага вырашэння задач сучаснага этнакультурнага працэсу. Адной з галоўных задач дзейнасці будучых спецыялістаў па фальклору з'яўляецца арганізацыя калектыўнай мастацкай творчасці на аснове святаў традыцыйнага календара, якія праз найстаражытную форму творчага кантактавання людзей – масавую абрадавую дзею - здольны і сёння актуалізаваць свае універсальныя глыбінныя сэнсы – сувязь соцыума з наваколлем і прыродным ланшафтам роднай зямлі, дэманстрацыю жыццёвых сіл грамадства ў еднасці адзін з адным і з прыродай.

Дысцыпліна "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура каляндарных абрадаў" разглядае шляхі і сродкі па засваенні і актуалізацыі беларускіх каляндарна-абрадавых традыцый, выпрацаваныя айчыннымі і замежнымі культуролагамі, фалькларыстамі і этнапедагогамі. Тэматычныя раздзелы курса абапіраюцца на асноўныя палажэнні па тэорыі і эстэтыцы фальклору і агульнадыдактычныя прынцыпы арганізацыі аматарскай творчасці, накіраваны на вывучэнне і засваенне рэгіянальных (лакальных) каляндарна-абрадавых традыцый Беларусі, практычнае ўвасабленне іх у выканальніцкай дзейнасці шляхам рэжысёрскага аналізу абрадавай дзеі, яе сцэнарнага праектавання і мастацкага рэканструявання ва ўмовах, набліжаных да аўтэнтычнага ўзору.

Раздзелы праграмы "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура каляндарных абрадаў" выяўляюць міждысцыплінарныя сувязі з курсамі "Фальклорны практыкум: беларускі народны каляндар", "Беларускі фальклор", "Этнафанічны практыкум: клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства" і "Абрадазнаўчы практыкум: клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства" спецыялізацый "Абрадазнаўства" і "Этнафоназнаўства". Ва ўзаемадзеянні ўсіх названых профільных дысцыплін спецыялізацый вучэбны курс "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура каляндарных абрадаў" заклікаsuccessfully ажыццяўляць асноўныя палажэнні па ахове, зберажэнні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і папулярызацыі каляндарна-абрадавага фальклору як каштоўнасці традыцыйнай нематэрыяльнай культуры[1] і як эфектыўнага сродка этнавыхавання і этнаэкалогіі.

Дысцыпліна “Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура каляндарных абрадаў” прасочвае перспектывы, формы і метады ўвядзення каляндарна-абрадавых святаў беларусаў у кантэкст сучаснай мастацкай культуры ў якасці эстэтычна арганізаванай традыцыі, якія назапашаны ў ХХ стагоддзі і выбудоўваюцца сёння ў рамках дзяржаўных праектаў, а таксама грамадскай этнакультурнай дзейнасці. Раздзелы праграмы разглядаюць розныя падыходы творчай рэалізацыі функцыянальна-семантычнага і эстэтычнага зместу беларускай калянадарнай абраднасці ў сучаснай аматарскай творчасці розных стылёвых накірункаў.

**Мэта курса** – узбагачэнне будучых спецыялістаў па фальклору тэарэтычнымі ведамі і практычымі навыкамі па засваенні і актуалізацыі каляндарна-абрадавых святаў шляхам іх мастацкага рэканструявання на рэгіянальнай дакументальнай аснове.

**Задачы курса:**

- фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу, эстэтычных крытэрыяў і творчай матываванасці да вывучэння і ўвасаблення каляндарна-абрадавых традыцый у рэчышчы іх мастацкага рэканструявання.
- авалоданне асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй, звязанымі з вывучэннем каляндарна-абрадавых цыклаў і прымеркаваных да іх танцавальна-гульнёвых, бяседных дзей;
- раскрыццё функцыянальна-семантычнага зместу каляндарных святаў і абрадаў;
- асэнсаванне працэсаў устойлівасці і пераемнасці, эвалюцыі і сучасных трансфармацый каляндарна-абрадавых святаў беларусаў;
- выпрацоўка практычных уменняў і навыкаў арганізацыі і правядзення каляндарна-абрадавых святаў у сучасных умовах у адэкватнай творчай інтэрпрэтацыі;
- фарміраванне аналітычнай кампетэнцыі і творчага мыслення на даследчым, сцэнарна-праектным і арганізацыйна-рэпетыцыйным этапах мастацкага ўвасаблення абрадаў.

**Спецыяліст павінен ведаць:**

- асноўныя тэарэтычныя паняцці, якія разглядаюцца ў межах дысцыпліны;
- навуковыя падыходы па класіфікацыі беларускіх каляндарных абрадаў і сістэматызацыі іх структурных элементаў;

[1] Закон “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь”; Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Аб зацвярджэнні Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны” ад 29.12.2004 г. №627.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- гісторыю і асноўныя накірункі даследавання каляндарна-абрадавых традыцый беларусаў;
- агульную характарыстыку і змест беларускіх абрадаў і свят гадавога цыкла і прымеркаваных да іх дзей, трапезы;
- рэгіянальныя асаблівасці беларускіх каляндарных абрадаў і арэал іх бытавання;
- метады мастацка-практычнай фалькларыстыкі па ўвасабленню каляндарна-абрадавых святаў, інавацыйныя канцэртна-сцэнічныя, фестывальныя тэхналогіі;
- сучасныя стылі і напрамкі творчай рэалізацыі беларускай калянадарнай абраднасці ў аматарскай творчасці.

**умець:**

- самастойна аналізаваць беларускія каляндарныя абрады, выбудоўваць архітэктоніку дзеі паводле іх структурных элементаў (кодаў);
- складаць картатэку каляндарных абрадаў і святаў рэгіёну, рэпертуарныя зборнікі фальклорных матэрыялаў;
- праектаваць сцэнарый на аснове акцыянальных кодаў абраду з улікам яго тэмпаральнага, лакатыўнага, персанальнага, атрыбутыўнага, музычна-вербальнага, музычна-інструментальнага, пластычнага кодаў;
- арганізоўваць і ўвасабляць абрадавую дзею ў рэчышчы яе мастацкага рэканстуявання і ў форме канцэртнай праграмы, тэматычнага фестывалю;
- ажыццяўляць рэпетыцыйны працэс з гуртамі-ілюстратарамі абрадавай дзеі;
- арганізоўваць працу па тэхнічнаму і інфармацыйнаму забеспячэнню святочнага мерапрыемства.

Усяго гадзін па дысцыпліне – 204, у тым ліку лекцыйных – 24, практычных заняткаў – 130, індывідуальных – 50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва раздзелаў і тэм | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практ. | Інд. | Усяго |
| | УВОДЗІНЫ. ПРАДМЕТ І ЗАДАЧЫ КУРСА. | 2 | | | |
| 1 | **Раздел 1**<br>КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЯ ПРАКТЫКА БЕЛАРУСАЎ І ЯЕ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЕ ПЕРААСЭНСАВАННЕ<br><br>Каляндарана-абрадавая практыка як арганізацыя мыслення і паводзін традыцыйнага грамадства | 4 | | | 2 |
| 2 | Этнаэкалагічны патэнцыял беларускіх каляндарна-абрадавых традыцый | 2 | | | 2 |
| 3 | Эстэтычная аснова засваення каляндарных абрадаў у вучэбна-выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці | 2 | | | 2 |
| 4 | **Раздел 2**<br>МЕТАДЫ МАСТАЦКА-ПРАКТЫЧНАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ ПА АКТУАЛІЗАЦЫІ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ ТРАДЫЦЫЙ<br><br>Методыка даследавання каляндарна-абрадавых традыцый | 2 | 10 | 2 | 14 |
| 5 | Засваенне каляндарнай абраднасці ў аматарскай творчасці | 2 | 10 | 2 | 14 |
| 6 | Сістэматызацыя тыпаў і форм фалькларызму па ўвасабленні фальклорнага мастацтва ў аматарскай творчасці | 2 | | | 2 |
| 7 | **Раздел 3**<br>АРГАНІЗАЦЫЯ АМАТАРСКАЙ ТВОРЧАСЦІ НА АСНОВЕ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ СВЯТ<br><br>Аматарская фальклорная дзейнасць на аснове беларускіх каляндарна-абрадавых свят | 2 | | | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 8 | Мастацкае рэканструяванне каляндарна-абрадавых свят на дакументальнай аснове | | 20 | 8 | 30 |
| 9 | Дапасаванасць да абрадавага свята ўмоўна-прымеркаваных падзей | | 10 | 4 | 14 |
| | РАЗДЗЕЛ 4.<br>СЦЭНАРНА-РЭЖЫСЁРСКАЯ РАСПРАЦОЎКА АБРАДУ КАЛЯНДАРНАГА ЦЫКЛУ | | | | |
| 10 | Рэжысёрскі аналіз каляндарна-абрадавага свята | 2 | 10 | 8 | 20 |
| 11 | Сцэнарнае праектаванне мастацкай рэканструкцыі святочнай дзеі | 2 | 10 | 10 | 20 |
| 12 | Пастановачная работа па ўвасабленні каляндарна-абрадавага свята | 2 | 20 | 4 | 24 |
| | РАЗДЗЕЛ 5.<br>ІНАВАЦЫЙНЫЯ ПАДЫХОДЫ ЎКАРАНЕННЯ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ ТРАДЫЦЫЙ У СУЧАСНАЕ МАСТАЦКАЕ ЖЫЦЦЁ | | | | |
| 13 | Актуалізацыя каляндарна-абрадавых традыцый у сучасных умовах | | 10 | | 12 |
| 14 | Мастацкая рэканструкцыя каляндарна-абрадавага свята ва ўрбанізаваных умовах | | 20 | 6 | 28 |
| 15 | Фестывальныя праекты на аснове традыцыйных каляндарных свят | | 10 | 6 | 18 |
| | **УСЯГО** | **24** | **130** | **50** | **204** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ КУРСА

## Уводзіны. Прадмет і задачы курса

Каляндарна-абрадавая традыцыя як аснова станаўлення і развіцця сучаснай святочнай культуры Беларусі. Арганізацыя фальклорнай дзейнасці сродкамі мастацкага рэканструявання каляндарна-абрадавых святаў як сацыяльна значная практыка этнакультурнай ідэнтыфікацыі і духоўнай кансалідацыі грамадзян сучаснай Беларусі.

Рэжысура каляндарных абрадаў у кантэксце захавання і папулярызацыі рэгіянальнай традыцыйнай культуры. Выпрацоўка механізмаў пераемнасці і трансфармацый каляндарна-абрадавага фальклору ў сучасных аматарскіх калектывах.

## Раздел 1
## КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЯ ПРАКТЫКА БЕЛАРУСАЎ І ЯЕ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЕ ПЕРААСЭНСАВАННЕ

### Тэма 1
### Каляндарна-абрадавая практыка як арганізацыя мыслення і паводзін традыцыйнага грамадства

Каляндарна-абрадавая традыцыя як эмацыйна збалансаваная сістэма жыццятворчасці соцыума ў прыродным асяроддзі.

Каляндарна-абрадавая практыка як арганізацыя мыслення і паводзін людзей - у сумеснай працы, маленні звышнатуральным сілам аб ураджаі, плёне ў гаспадарцы і сям'і, абагаўленні сіл прыроды.

Матывацыя абрадавых практык (вербальных, этнафанічных, пластычных, маскіравання) у традыцыйнай супольнасці – забеспячэнне збалансаванасці быцця соцыума ў рытме з прыроднымі і жыццёвымі цыкламі. Функцыянальнасць каляндарных абрадаў (дамінуюць магічная сугестыўная і нарматыўна-рэгламентуючая функцыі, спадарожнічае эстэтычная).

### Тэма 2
### Этнаэкалагічны патэнцыял беларускіх каляндарна-абарадавых традыцый

Традыцыя як этнаэкалагічны фактар і ўмова бяспечнага, камфортнага самаадчування чалавека ў грамадстве.

Каляндарна-абрадавы комплекс як рычаг кіравання прыроднымі цыкламі і сродак умацавання сувязей людзей і наваколля.

Выхаваўчая роля каляндарных абрадаў сучасным вучэбна-выхаваўчым працэсе: фарміраванне ў дзяцей пачуццяў любові да роднай зямлі, павагі да сваіх каранёў, гуманнага стаўлення да чалавека і ўсяго жывога.

### Тэма 3
### Эстэтычныя асновы засваення каляндараных абрадаў у вучэбна-выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці

Эстэтычная канцэпцыя рэканструявання народных мастацкіх традыцый метадамі мастацка-практычнай фалькларыстыкі культуролага У. М. Конана. Эстэтычная самадастатковасць і сугестыўнасць фальклорнай традыцыі.

Актуалізацыя каляндарна-абрадавых святаў як развітой мастацкай сістэмы. Шляхі і перспектывы ўвядзення каляндарна-абрадавых святаў у кантэкст сучаснай мастацкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры ў якасці эстэтычна арганізаванай традыцыі. Тэарэтычная і практычная распрацоўка метадаў мастацка-практычнай фальклярыстыкі навукоўцамі і этнапедагогамі краіны.

## Раздел 2
## МЕТАДЫ МАСТАЦКА-ПРАКТЫЧНАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ ПА АКТУАЛІЗАЦЫІ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ ТРАДЫЦЫЙ

### Тэма 4
### Методыка даследавання каляндарна-абрадавых традыцый

Методыка даследавання традыцыйных абрадаў расійскіх вучоных М.І. і С.М. Талстых. Архітэктоніка абрадавай дзеі як сукупнасць раўназначных па функцыянальна-семантычнай нагрузцы кодаў: тэмпаральны код – час правядзення абраду (свята); акцыянальны код – ход абрадавых падзей; лакатыўны код – месца правядзення абраду (свята); персанальны код – кола ўдзельнікаў, наяўнасць маскіраваных персанажаў; атрыбутыўны код – выкарыстанне абрадавых атрыбутаў, адзення, маскіравання; музычны код – тыпавыя напевы з адмысловымі этнафанічнымі прыкметамі і гукаідэал інструментльнай этнафоніі; вербальны – наяўнасць заклікаў, замоў, зычэнняў, праклёнаў, дыялогаў у абрадзе.

Узоры класіфікацыі і сістэматызацыі абрадавых святаў беларускага календара айчынных фальклярыстаў А.С. Ліса, У. А. Васілевіча, А.Ю. Лозкі, В. Д. Ліцвінкі, З. Я Мажэйка, Г. А. Барташэвіч і інш.

### Тэма 5
### Засваенне каляндарнай абраднасці у аматарскай творчасці

Этапы засваення, арганізацыі і правядзення каляндарна-абрадавага свята.

*Падрыхтоўчы – даследчы этап.* Тэарэтычны аналіз каляндарна-абрадавай традыцыі і яе рэгіянальных адметнасцей. Збор факталагічнага матэрыялу, пашпартызацыя фальклорных узораў. Складанне абрадавай карты свята, у якой прыведзена сістэматызацыя яго структурных кампанентаў (кодаў) паводле прапанаванай методыкі М.І. і С.М. Талстых, на аснове іншых падыходаў айчынных і замежных фальклярыстаў. Расшыфроўка і сістэматызацыя песенных і вербальных тэкстаў абраду.

*Арганізацыйна-метадычны этап.* Афармленне падабраных этнафанічных, вербальных, танцавальна-гульнёвых узораў у рабочы рэпертуараны зборнік альбо ў фанатэку. Складанне сцэнарыя паводле акцыянальных кодаў абрадавага свята з больш дэталёвым пазначэннем ходу абрадавых падзей і асобных момантаў свята, часу і месца іх правядзення; кола ўдзельнікаў і завадатараў свята, абрадавых персанажаў, маскіравання і атрыбутыкі; зместу прымеркаванай да свята рэкрэацыйна-забаўляльнай часткі. Рэжысёрскае вырашэнне кожнага з эпізодаў свята.

*Вучэбна-рэпетыцыйны этап.* Стварэнне фальклорнай групы выканаўцаў-ілюстратараў адпраўлення абраду, засваенне ёю адпаведнага песеннага, музычнага, харэаграфічнага, гульнёвага, тэатральнага матэрыялу (з рабочага рэпертуарнага зборніка), выраб касцюмаў і святочнай атрыбутыкі, размеркаванне роляў у абрадавай дзеі, вызначэнне лідэраў-завадатараў свята і адказных па арганізацыйных пытаннях.

*Прэзентацыйны - творчы этап.* Мастацкая рэканструкцыя свята ў натуральных умовах бытавання. Канцэртная праграма паводле рэгіянальных каляндарных абрадаў.

*Аналітычны этап.* Аналіз зробленай мастацка-фальклярыстычнай працы, яе дакументаванне і архівацыя, папулярызацыя ў СМІ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 6**
**Сістэматызацыя тыпаў і форм фальклярызму па ўвасабленні фальклорнага мастацтва ў аматарскай творчасці**

Класіфікацыя тыпаў і форм фальклярызму ў аматарскай творчасці (паводле І.І. Зямцоўскага, А.М. Аляхновіча). Рэстаўраваны і рэканструяваны фальклор. Рэпрадуктыўны тып фальклярызму (засваенне мастацкай традыцыі рэгіёну вусным шляхам). Апрацаваны фальклор з улікам рэгіянальных асаблівасцяў. Стылізаваныя формы ўвасаблення фальклорнага мастацтва (акадэмізаваны тып фальклярызму; фольк-мадэрн; інш.).

Дзейнасць фальклорных гуртоў (асобных спевакоў і музыкантаў) рэпрадуктыўнага тыпу фальклярызму, вопыт іх мастацка-фальклярыстычнай дзейнасці.

**Раздел 3**
**АРГАНІЗАЦЫЯ АМАТАРСКАЙ ТВОРЧАСЦІ НА АСНОВЕ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ ТРАДЫЦЫЙ**

**Тэма 7**
**Аматарская фальклорная дзейнасць на аснове беларускіх каляндарна-абрадавых святаў**

Аматарскія фальклорныя калектывы і іх роля ў захаванні і трансляцыі каляндарана-абрадавых традыцый.

Структурныя падраздзяленні сістэмы культуры і адукацыі, закліканыя ажыццяўляць ахову і зберажэнне аўтэнтычнай традыцыі, працэс яе пераемнасці і папулярызацыі (раённыя і абласныя аддзелы культуры і адукацыі, арганізацыйна-метадычныя цэнтры, Палацы культуры, Дамы фальклору, Цэнтры народнай творчасці, Цэнтры пазашкольнай работы, музеі, аматарскія фальклорныя калектывы, краязнаўчыя гурткі).

Перспектыўнае планаванне навукова-метадычнай, вучэбна-выхаваўчай работы, канцэртна-святочнай дзейнасці ў названых установах (іх структурных адзінках) на аснове рэгіянальных каляндарна-абрадавых традыцый.

**Тэма 8**

**Мастацкае рэканструяванне каляндарна-абрадавых святаў на дакументальнай аснове**

Актуалізацыя каляндарна-абрадавай традыцыі ў грамадстве (правядзенне свят, канцэртаў, фестываляў, вечарын і лекторыяў).

Тэхналогія ўкаранення каляндарна-абрадавах практык у сучасны культурны кантэкст.

Сістэмнасць вучэбна-выхаваўчай работы і творчага працэсу ў аматарскіх фальклорных калектывах у межах гадавога святочнага цыклу рэгіёна.

<u>Зімовы цыкл:</u> Калядны карнавал на Поўдні Беларусі; Калядны абход і абрадавыя гульні на Поўначы; “Царкоўныя калядкі” на Панямонні; лакальныя абрады (“Конікі” у Давыд-Гарадоцкім раёне, “Тры каралі” на захадзе Гродзеншчыны і Віцебшчыны, “Калядныя цары” у вёсцы Семежава Капыльскага раёна, інш.).

<u>Веснавы цыкл:</u> рытуалы Масленічнага тыдня; Гуканне вясны; Юр’я; Вялікодны абрад; веснавы абрадавы цыкл “Ваджэнне і пахаванне стралы” на Веткаўскім Пасожжы; траецкія цырымоніі (“Кумленне” на Падзвінні і Падняпроўі, “Русальны тыдзень” на Гомельскім Палессі, “Ваджэнне Куста” на Піншчыне, Лунінеччыне і Століншчыне)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лакальныя абрады (“Пахаванне бабы і дзеда” на Масленку ў Гарадоцкім раёне “; загукальны абрад “Галэля” і велікодны “Стрылка” у Драгічынскім раёне, “Тураўскі карагод” на свята “Юр’я” у Жыткавіцкім раёне, інш.).

Летні цыкл: Купалле, Зажынкі і Дажынкі.

Восеньскі цыкл: Багач, Дзяды, лакальны абрад “Жаніцьба коміна” на Піншчыне і Тураўшчыне.

### Тэма 9
### Дапасаванасць да абрадавага свята умоўна-прымеркаваных падзей.

Сезонна прымеркаваныя ігрышчы, вячоркі, бяседы.

Традыцыйная бяседа і яе складнікі: сямейна-бытавыя, любоўныя, лірычныя песні і балады, сацыяльна-бытавыя, жартоўныя песні, вусна-паэтычныя творы (легенды, паданні, казкі, загадкі, жарты, анекдоты). Танцы з прыпеўкамі. Умоўна-прымеркаваныя гульні і карагоды.

## Раздзел 4.
## СЦЭНАРНА-РЭЖЫСЁРСКАЯ РАСПРАЦОЎКА АБРАДУ КАЛЯНДАРНАГА ЦЫКЛУ

### Тэма 10
### Рэжысёрскі аналіз каляндарна-абрадавага свята.

Гісторыка-рэтраспектыўны аналіз развіцця абраду. Выяўленне агульнанацыянальных заканамернасцей, рэгіянальных і мясцовых адметнасцей абраду.

Ідэйна-тэматычны аналіз. Ідэя. Тэма. Архітэктоніка абраду як паслядоўнасць разгортвання яго функцыянальна-семантычных кодаў у прасторы і часе. Суразмернасць, лагічнасць, альбо кантраснасць частак (этапаў) абрадавай дзеі. Умоўна-прымеркаваная да абраду танцавальна-гульнёвая частка, пазаабрадавая бяседная. Абрадавая (пазаабрадавая) трапеза.

Структура абраду ў кампазіцыйнай пабудове: пралог, экспазіцыя, завязка, развіццё дзеі, кульмінацыя, развязка, фінал. Сцэнарна-рэжысёрскі ход.

### Тэма 11
### Сцэнарнае праектаванне святочнай дзеі.

Рэжысёрскае бачанне абрадавай дзеі: вызначэнне звышзадачы, скразнога дзеяння абраду і яго рытуалаў-складнікаў. Работа з мастаком, музычным кіраўніком, харэографам па ўвасабленні абраду.

Асноўныя прынцыпы сцэнарнага праектавання мастацкай рэканструкцыі свята: вызначэнне часу і месца адпраўлення абраду; прасторавае рашэнне (мізансцэніраванне) яго этапаў і іх асобных фрагментаў (зоны дзеяння - абрадавыя пляцоўкі, апорныя і перыфірыйныя пункты); вылучэнне абрадавых рытуалаў у адмысловыя тэматычныя часткі (музычна-вербальныя блокі); дэталёвае апісанне паслядоўнасці выканання пэўных дзеянняў з адпаведным песенным, вербальным, інструментальным, пластычным, атрыбутыўным суправаджэннем; прымеркаванасць да сакральнай абрадавай часткі свята рэкрэацыйнай пазаабрадавай (танцавальна-гульнёвага ігрышча, бяседы з частаваннем).

Сцэнарны фонд сцэнічнай адаптацыі і мастацкай рэканструкцыі беларускіх каляндарна-абрадавых святаў (П.А. Гуд, А.А. Хатэнка, А.М. Аляхновіч, М.Ф. Макарцоў, І.І. Сучкоў, А. Я. Камінскі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 12**
**Пастановачная работа па ўвасабленні каляндарна-абрадавага свята.**

Сінкрэтычны падыход да ўвасаблення абраду: ў рэчышчы мастацкага рэканструявання, канцэртна-сцэнічнага відовішча.

Поліфункцыянальнасць прафесійнай кампетэнцыі арганізатараў традыцыйнага свята: здольнасць увасобіць сінкрэтызм усіх відаў фальклорнага мастацва ў каляндарна-абрадавай дзеі як шматпланавай драматычнай партытуры. Кананічнасць адпраўлення абраду паводле рэгіянальнага аўтэнтычнага ўзору і імправізацыя як феномен творчага самавыражэння выканаўцаў.

Рэпетыцыйны працэс з гуртамі-ілюстратарамі абраду. Тыпы рэпетыцый: застольная, планіровачная (т. зв. "у выгарадках"), рэпетыцыя асобных франментаў ( музычных, харэаграфічных, вербальных), зводная, мантажная, прагонная, генеральная.

Вытворча-тэхнічныя пытанні арганізацыі і правядзення святочнай праграмы. Складанне каштарыса: аплата сцэнарыя і рэжысуры, тэхнічных сродкаў; выраб элементаў дэкаратыўнага афармлення, касцюмаў, мэблі, рэквізіта, атрыбутыкі; камандзіровачныя выдаткі; харчаванне і размяшчэнне ўдзельнікаў праграмы; прызавы фонд; транспартныя выдаткі, непрадбачныя выдаткі.

**Раздзел 5.**
**Інавацыйныя падыходы ўкаранення каляндарна-абрадавых традыцый у сучаснае мастацкае жыццё**

**Тэма 13**
**Актуалізацыя каляндарна-абрадавых традыцый у сучасных умовах.**

Сучасны стан і перспектывы ўвядзення каляндарна-абрадавых святаў у сучаснае мастацкае жыццё.

Дзяржаўныя і грамадскія этнакультурныя праекты XX-XXI ст. на аснове каляндарнай абраднасці беларусаў: святы ў г. Мінску, г. Заслаўі, в. Вязынка, Строчыцы, інш. Этнавыхаваўчыя праекты з уключэннем каляндарна-абрадавага фальклору ("Традыцыйная культура і дзеці", "Этнашкола", "Змена этнакультурнага выхавання у НДАЛ "Зубраня", "Рэспубліканская сезонная фальклорная школа").

Сучасныя формы актуалізацыі каляндарна-абрадавых традыцый (этнаграфічны і пост-фальклорны канцэрты, танцавальна-гульнёвая вечарына, музычная гасцёўня, этнадыскатэка, мастацкі перфоманс, кіналекторый этнаграфічных фільмаў, тэле-радыёпраграмы, фальклорны летнік, фальклорны фестываль).

**Тэма 14**
**Сцэнічная інтэрпрэтацыя каляндарна-абрадавага фальклору.**

Спецыфіка канцэртна-сцэнічнай пастановачнай работы па ўвасабленню каляндарна-абрадавага фальклору. Рэжысёрскае бачанне каляндарна-абрадавай дзеі ва ўмовах сцэны. Прасторавае рашэнне асноўных этапаў і эпізодаў сцэнічна адаптаванага каляндарнага свята.

Узоры сцэнічнай інтэрпрэтацыі каляндарна-абрадавага фальклору аматарскімі калектывамі Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сцэнарнае праектаванне канцэртнай праграмы паводле каляндарна-абрадавых святаў ва ўмовах іх сцэнічнай адаптацыі. Методыка стварэння літаратурнага сцэнарыя паводле каляндарна-абрадавай дзеі.

## Тэма 15
## Мастацкая рэканструкцыя каляндарна-абрадавага свята ва урбанізаваных умовах.

Гарадское свята на каляндарна-абрадавай аснове як адна з форм этнаідэнтыфікацыі ва урбанізаваным грамадстве.

Спецыфіка мастацкай рэканструкцыі свята ў гарадскіх умовах. Пастаноўка свята у дзвюх частках: абрадавай і прымеркаванай танцавальна-гульнёвай. Спалучэнне тэхналогій пастановачнай работы і інтэрактыўнага ўзаемадзеяння з гледачом праз найбольш прыдатныя камунікацыйныя формы адпраўлення абраду (сумесна выкананыя карагод, прыпеў песні, антыфонныя спевы (па чарзе двума-трыма гуртамі), гульню, танец).

Сцэнарнае праектаванне гарадскога свята на аснове каляндарна-абрадавых традыцый рэгіёнаў Беларусі.

## Тэма 16
## Фестывальныя праекты на аснове традыцыйных каляндарных святаў.

Фестывальны фальклорны рух на Беларусі (Першы Міжнародны фестываль фальклору, фестывалі “Беларуская полька”, “Звіняць цымбалы і гармонік”, “Берагіня”, “Радавод”, “Калядны фэст”, “Веснавы танок”).

Фестывальны праект паводле каляндарнага свята (цыклу). Палажэнне аб правядзенні фальклорнага фестывалю з уключэннем каляндарна-абрадавых святаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

## *Асноўная*


1. Барташэвіч, Г.А. Жанравая спецыфіка каляндарана-абрадавай паэзіі ўсходніх славян // Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 477 с.
2. Беларускі народны каляндар / аўт. - уклад. А.Ю. Лозка ; маст. А.І. Дашкевіч. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с. : іл.
3. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2005. – 2006.
4. Валачобныя песні / склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей; рэд. тома К.П. Кабашнікаў. – Мн.: навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
5. Васілевіч, У.А. Беларускі народны каляндар / У.А. Васілевіч. – Мінск: Ураджай. 1993. – 80 с.
6. Веснавыя песні / АН БССР, Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; [склад. : Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей, склад. муз. часткі В.І. Ялатаў ; рэд. К.П. Кабашнікаў]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 608 с. : нот. іл.
7. Гуд, П.А. Тэхналогія стварэння свята: вучэб. дапам. / П.А. Гуд. – 2 - е выд. – Мінск : БДУКМ, 2008. – 224 с.
8. Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.с. Фядосік [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 1996. – 534 с.
9. Жаніцьба Цярэшкі / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Л.М. Салавей. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 518 с.
10. Жартоўныя песні / АН БССР, Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; склад. І.К. Цішчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 728 с.
11. Жніўныя песні / АН БССР, Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка", 1974. – 816 с. : нот. іл.
12. Земляробчы каляндар. Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.І. Гурскага; уступ. Арт. А.І. Гурскага, А.С. Ліса, 2-е выд., выпр. - Мн.: Бел. навука, 2003. – 429 с.
13. Зімовыя песні / АН БССР, Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. М.Я. Грынблат. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 736 с. – (Беларус. нар. творчасць).
14. Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Савіцкі; навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мн.: Бел. Навука, 2001. – 515 с.
15. Камінскі, А.Я. Рэжысура традыцыйнага абраду: вучэб.-метад. дапам. / А.Я. Камінскі. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009.– 112 с.
16. Купальскія і пятроўскія песні / [Уклад. А.С. Ліса, С.Т.Асташэвіч; Уклад. муз. Часткі Г.В.Таўлай; Рэд. А.С.Фядосік]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. – 631 с., нот. іл.
17. Кухаронак, Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т.І. Кухаронак. – Мн.: Ураджай, 2001. – 239 с.
18. Ліс, А.С. Валачобныя песні / А.С. Ліс. – Мн.: Навука і тэхніка, 1989. – 207 с.: іл.
19. Ліс, А.С. Жніўныя песні / А.С. Ліс. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993.–283 с.
20. Ліс, А.С. Каляндарна – абрадавая творчасць беларусаў : сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / А.С. Ліс – Мн.: Бел. навука, 1998. – 188 с.
21. Ліцвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў /В.Д. Ліцвінка. – Мн.: Беларусь, 1997.- 176 с.: іл.
22. Можейко, З.Я. Календарно - песенная культура Белоруссии : опыт системно – типологического исследования / З.Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.
23. Паэзія беларускага земляробчага календара [Уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. А. С. Ліса. Рэд. А.С.Фядосік]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 631 с. – (Беларус. нар. творчасць /АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).
24. Песні пра каханне / АН БССР, Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 378 с. – (Беларус. нар. творчасць).
25. Прыпеўкі / склад. І.К. Цішчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 451 с. - (Беларус. нар. творчасць).
26. Толстой, Н. И., Толстая, С. М. К реконструкции древнеславянской духовной культуры (лингво- и этнографический аспект)// Славянское языкознание / VIII Междунар. Съезд славистов, Загреб-Любляна, сент. 1978 г. – М.: наука, 1978. – 469 с., 1 л. карт.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

27. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6т. / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]; склад. Т. Б. Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004. – Т. 2. Віцебскае Падзвінне. - 910 с.
28. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В.І.Басько [і інш.]. – Мн.: Выш. шк., 2006. - Т. 3: Гродзенскае Панямонне. – 608 с.
29. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]; – Мн.: Бел. навука, 2001.- Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе.–790 с.

*Дадатковая*

1. Алексеев, Э.Е. Фольклор в контексте современной культуры : рассуждения о судьбах народной песни / Э.Е. Алексеев. – Москва : Совет. композиторов, 1988.
2. Аляхновіч, А.М. Народная песня ў мастацкай самадзейнасці / А.М. Аляхновіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1991.
3. Аляхновіч, А.М. Калядны абрад: сцэнарна-метадычныя рэкамендацыі па правядзенні клубных мерапрыемстваў / А.М. Аляхновіч, П.А. Гуд. – Мн.: Рэсп. Навук.-мет. Цэнтр нар. творчасці, 1991.
4. Барташэвіч, Г.А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя / Г. А. Барташэвіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1995. – 184 с.
5. Беларуская міфалогія: энцыклапед. Слоўнік / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімовіч. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.
6. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Брэсц. вобл. Традыцыйныя жанры. Склад. В.А.Захарава. Мн., Выд-ва БДУ, 1973.
7. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыц. жанры: Гомел. вобл. /Уклад.В.А.Захарава і інш.; Уклад. муз . часткі У.І.Раговіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1989. – 384 с.: іл., нот. іл.
8. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Трад. Жанры: Мінск. вобл. /Уклад.В.Д.Ліцвінка; Уклад. муз . часткі Г.Р.Кутырова. – Мн.: Універсітэцкае, 1995.
9. Беларускі фальклор у школе. Дапам. для настаўніка /І.І.Сучкоў, Ф.І.Таранава, Л.У.Рута, В.В. Куржалава. – Мн.: Нар. Асвета, 1996.
10. Беларускія традыцыйныя абрады і святкаванні. Метад. рэк. для сярэдніх спец. нав. устаноў. Мн. 1991.
11. Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л.П. Касцюкавец. – Мн.: Беларусь, 1994.- 128 с.
12. Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі / В.Ф. Бацяеў [і інш.]; рэдкал.: В.М.Бялявіна [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 2002. – 606 с.: іл.
13. “Берагіня”. Чацвёрты рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва (2005-2006)/Аўтар-укладальнік М.А.Козенка. – Мінск: “Чатыры чвэрці”, 2006.
14. Варфаламеева Т.Б. Ахова і захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны як сфера сацыяльна-культурнай палітыкі беларускай дзяржавы на сучасным этапе: праблемы і перспектывы//Аўтэнтычны фальклор: праблемы бытавання, вывучэння, перайманія: матэрыялы навук.-метад. Канф. (15-16 сакавіка 2007 г.) / рэдкал.: М. Л. Кузьмініч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Бел. Дзярж. Ун-т культуры і мастацтваў, 2007.
15. Восточно - славянский фольклор : слов. науч. и нар. терминологии / АН Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы ; редкол. : К.П. Кабашников (отв.ред.) [и др.]. – Минск: Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.
16. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мн.: Навука і тэхгіка, 1993. – 253 с.: іл.
17. Гуд, П. А. Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П.А. Гуд – 2-е выд., стэрэатып. – Мн.: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2006. – 137 с.
18. Гуд, П. А. Беларускі кірмаш / П.А. Гуд, Н.І Гуд. – Мн.: Полымя, 1996. – 270 с.: іл.
19. Гуд, П. А. Святы, якія заўжды з намі: гульнявыя праграмы “Ад Каляд да Пакроваў” / П.А. Гуд. – Мн.: Красіка-Прынт, 2000. – 224 с.
20. Гурскі, А.І. Святкаванне Каляд на Беларусі / А.І. Гурскі. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 94 с.
21. Гусев, В.Е. Эстетика фольклора / В.Е. Гусев. – Л.: Наука, 1967.–318 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

22. Ехала каляда ў чырвоным вазочку: Матэрыялы для правядзення навагодніх калядных свят/Рэсп. Цэнтр эстэтычнага выхавання дзяцей. Мн., 1990.
23. Кабанов А.С. Перспективы фольклорного движения в современном народном творчестве. Методические рекомендации. М., 1989.
24. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: исторические корни и развитие обычаев. – М.: Наука, 1983.
25. Конан, У.М.. Выбранае / уклад. М.А. Козенкі; прадм. М.А.козенкі. – Мінск: Смэлтак, 2009. – 536 с.: іл. – (Выдатныя постаці Беларусі).
26. Міфы бацькаўшчыны \ уклад. У.А.Васілевіч. – Мн.: БелЭн, 1994.–109 с.
27. Можейко З.Я. Песенная культура Белорусского Полесья: Село Тонеж / З.Я. Можейко. – Мн.: Наука и техника, 1971. – 263 с.: ил. и нот.
28. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў: вучэб-метад. Дапам. / аўт.-склад. Т.І. Кухаронак, в.Г. Кухаронак. – Мн.: БДПУ, 2005. – 108 с.
29. Соколова, В. К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. XIX – начало XX в./В. К. Соколова. – Москва: Наука, 1979. – 288 с.
30. Тавлай, Г. В. Белорусское купалье: Обряд, песня./ Г. В. Тавлай – Мн.: Наука і техніка, 1986. – 174 с.:іл.
31. Сівурава. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял фестывальнай дзейнасці ў сферы народнай мастацкай творчасці//Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып. 3. Матэрыялы IV Рэсп. Навук.-практ. Канф. (2-3 крас. 2008 г., г.п. Акцябрскі) / аўт. Праекта і ўклад. М.а. Козенка. – Мінск: БелДІПК, 2008.
32. Смірнова І.Ю. Песенная прастора вясны. Ушэсце ў Неглюбцы. // Матэрыялы II Міжнароднай навуковай фальклорна-этналінгвістычнай канферэнцыі “Комплекснае даследванне фальклору і этнакультуры Палесся”. Мн., 2005, с. 225-230.
33. Чацвёрты рэспубліканскі фестываль народнага танца “Беларуская полька”. Аўтар-складальнік М.А.Козенка. – Мінск: “Чатыры чвэрці”, 2000.
34. Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы. – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2007.
35. Хвір Н.Д. Нематэрыяльная спадчына Беларусі.//Палявая фалькларыстыка і этналогія: даследаванне лакальных культуры Беларусі / уклад. І. Ю. Смірновай; пад рэд. В. А. Лабачэўскай . – Мінск: БДУКіМ, 2008.

## КІНА- , ВІДЭАГРАФІЯ

1. Галасы зямлі маёй / Сцэн. І. Назіна, Р.Гамзовіч. – Белвідэацэнтр, 1993.
2. Голоса веков / Сцен. З. Можейко. - Белорусьфильм, ВА “Летапіс”, 1979.
3. Калядныя цары / Сцэн. Т.Кухаронак. – Белвідэацэнтр, 1997.
4. Крывыя вечары / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА “Летапіс”, 1993.
5. Мужчынскі рой (Дзятлаўскія дзяды) / Сцэн. І.Мацыеўскі. Белтэлефільм, 1996.
6. Память столетий / Сцен. З. Можейко. - Белорусьфильм, ВА “Летапіс”, 1982.
7. Полесские колядки / Сцен. З. Можейко. - Белорусьфильм, ВА “Летапіс”, 1972.
8. Пранясі, Божа, хмару / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА “Летапіс”, 1990.
9. Рассыпушка / Сцэн. Г.Таўлай. Белвідэацэнтр, 1995.
10. Рух зямлі / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА “Летапіс”, 1999.
11. У святыя вечары на каляды / Сцэн. М.Козенка. - Беларусьфільм, ВА “Летапіс”, 1996.
12. Чачэрскі куфэрак / Сцэн. М.Козенка. - РЦ “арт-фільматэхнік”, 1991.
13. Каляды ў вёсках Ананчыцы і Рог Салігорскага раёна / Сцэн. Р.Гамзовіч - ТА “Радавод” Белдзяржтэлерадыё, 1997
14. Вялесавы ўнукі / Сцэн. Р.Гамзовіч - ТА “Радавод” Белдзяржтэлерадыё, 1997
15. “Каляды ў Жыткавіцкім раёне” / Сцэн. Р.Гамзовіч - ТА “Радавод” Белдзяржтэлерадыё, 1998
16. “Ты ляці, страла” / Сцэн. Р.Гамзовіч. – ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 2006.
17. “Купалле на Полаччыне” / Сцэн. Р. Гамзовіч, Г. Таўлай. – ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1995.
18. “Жаніцьба Коміна” / Сцэн. Р.Гамзовіч. – ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1999.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ